**Коц А. Л.**

# СПЕЦЫФІКА АПРАЦОЎКІ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ЗНАХОДАК З РАСКОПАК НА ПОМНІКАХ АРХІТЭКТУРЫ СТАРАЖЫТНАРУСКАГА ПЕРЫЯДУ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ДАСЛЕДАВАННЯЎ СПАСА-ПРААБРАЖЭНСКАГА ХРАМА Ў ПОЛАЦКУ)

***Ключавыя словы:*** старажытнаруская архітэктура, Полацк, Спаса-Праабражэнскі храм, фрэскі, плінфа.

Вывучэнне помнікаў архітэктуры з’яўляецца важнай вехай у даследаванні тэндэнцый эканамічнага і культурнага развіцця пэўнага рэгіёна. За савецкім часам склалася некалькі цэнтраў па вывучэнні старажытнарускай архітэктуры на прасторах былога СССР. Галоўным цэнтрам былі ўстановы г. Ленінграда (цяпер Санкт-Пецярбурга). Гэта Дзяржаўны Эрмітаж, Ленінградскі аддзел Інстытута археалогіі АН СССР (цяпер ІГМК РАН) і Ленінградскі Дзяржаўны ўніверсітэт (цяпер СпбДУ). Ленінградскія даследчыкі працавалі на шэрагу помнікаў архітэктуры на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і ў Полацку. Але сваёй навуковай школы па вывучэнні старажытнарускай архітэктуры ў Беларусі не склалася. У айчынай археалогіі вырасла толькі некалькі навукоўцаў, якія займаліся даследаваннямі архітэктуры азначанага перыяду [5, с. 37-43]. На сённяшні дзень практыка даследаванняў культавых і грамадскіх пабудоў 11-13 стст. фактычна адсутнічае.

У 2015 г. былі распачаты археалагіччныя раскопкі пры Спаса-Праабражэнскім храме (далей Спаская царква), якія працягваюцца да сённяшняга дня[1]. У Полацку гэта першыя мэтанакіраваныя даследаванни помніка старажытнарускай архітэктуры з пачатку 1990-ых гг.

Археалага-архітэктурныя даследаванні паказалі на існаванне прыбудоў да асноўнага аб’ёма храма. Яны складаліся з паўднёвай і паўночнай галерэі, з захаду быў прыбудаваны экзанартэкс з прытворам. Галерэі ў першую чаргу прызначаліся для пахавання: тут выяўлена вялікая колькасць плінфяных саркафагаў. Абсалютная большасць з іх была разрабавана, значна пашкоджана ці нават знішчана. У заходняй частцы паўднёвай галерэі быў выяўлены падземны храм – унікальны архітэктурны аб’ект: невялікае памяшканне з алтаром, якое цалкам заглыблена ніжэй узроўню дзённай паверхні 12 ст. Усе названыя прыбудовы Спаскага храма былі зруйнаваны ў канцы XVII ст. Ад гэтага часу да нашых дзён сфарміравалася ўстойлівае ўяўленне, што царква, ад якой застаўся толькі асноў аб’ём, была ўзведезна Еўфрасінняй Полацкай у такім выглядзе.

---

[1] Даследаванні арганізаваны Полацкім дзяржаўным універсітэтам пры ўдзеле Дзяржаўнага Эрмітажа Расіі.

Паколькі асноўны аб'ём храма захаваўся амаль у некранутым выглядзе, то тут мае месца быць і архітэктурным даследаванням, якія таксама арганізавана праводзяцца з 2015 г.[1]

Раскопы, якія мелі на мэце вывучэнне прыбудоў, пачалі распрацоўвацца толькі з 2017 г. За шэсць гадоў закладзена 5 раскопаў агульнай плошчай каля 220 м$^2$. Да сённяшняга дня Спаса-Праабражэнскі храм цалкам аколены археалагічнымі раскопамі. Застаюцца не вывучанымі толькі паўночная частка паўночнай галерэі і старажытны прытвор. Таксама было закладзена 7 шурфоў у інтэр'еры храма.

У працэсе археалагічных даследаванняў былі выяўлены архітэктурныя канструкцыі і зафіксаваны каштоўнейшыя знаходкі, а таксам сабрана багатая калекцыя фрагментаў тынкоўкі з манументальным жывапісам, які некалі ўпрыгожваў сцены галерэй. Калекцыя археалагічных артэфактаў ў першую чаргу складаецца са знаходак будаўнічых матэрыялаў: фрагментаў плінфы, кавалкаў тынкоўні, кавалкаў каменных крышак саркафагаў, плітак падлогі, мальты і інш. Іншыя знаходкі прадстаўлены побытавымі рэчамі, прадметамі культавага прызначэння, упрыгожваннямі, косткамі жывёл і рыб, бытавой керамікай. Пасля разбурэння галерэй вакол храма арганізаваны могілкі: было выяўлена больш 150 некранутых пахаванняў.

Новыя падыходы і методыкі ў вывучэнні старажытнарускай архітэктуры, у тым ліку з выкарыстаннем высокатэхнічнага абсталявання, абумовілі патрэбу ў больш дэталёвым вывучэнні, захаванні і рэстаўрацыі археалагічных артэфактаў. У першую чаргу гэта датычыцца будаўнічых матэрыялаў.

У першую чаргу апрацоўка плінфы заключаецца ў фіксацыі параметрычных дадзеных: даўжыня, шырыня і таўшчыня. Найбольшую цікавасць уяўляе сабой цэлая плінфа, але знаходкі цэлых экземпляраў у межах раскопа вельмі рэдкія. Як правіла пры разбурэнні старажытных архітэктурных канструкцый цэлую плінфу маглі разбіраць для другаснага выкарыстання. Калі цэлая плінфа выяўлена ў некранутай кладцы (in situ), то яна не падлягае выманню. Нават, калі ў час даследаванняў ў межах раскопа не было выяўлена цэлых экземпляраў старажытнай цэглы. У супрацьлеглым выпадку гэта можна параўнасць з разбурэннем помніка архітэктуры. Тое самае датычыцца і вялікіх па памеры блокаў кладкі, калі яны выяўлены не in situ, яны павінны быць вынуты з раскопа і ў далейшым перададзены на рэстаўрацыю і на захаванне не разабранымі, ў цэлым выглядзе. У даследаваннях ста-

[1] Асноўная маса даследаванняў па вывучэнні архітэктуры наземнай часткі помніка праведзена супрацоўнікамі Дзяржаўнага Эрмітажа Расіі з удзелам беларускіх спецыялістаў. Таксама агульныя даследаванні архітэктуры Спаса-Праабражэнскага храма праводзіўся рэстаўратарам У.В. Ракіцкім у межах аднаўлення ансамблю фрэскавага жывапісу з 1990-ых гг.

ражытнарускай архітэктуры ёсць прыклады, калі фрагменты сцен маглі быць разабраныя і перанесены на іншае месці ці ў музейную калекцыю. Але такія прыклады датычыцца кладак з вапняковых (ці іншага матэрыялу) блокаў вялікага памеру, цэглы на моцнай рошчыне, але не плінфяной кладкі на цамянцы. Вядомым прыкладам пераnясення рэштак муараванага помніка з'яўляецца Верхняя царква ў Гародні [1, с. 184]. Вялікія кавалкі кладкі з плінфы немагчыма перанесці шляхам разбірання з прычыны разбурэння рошчыны.

Параметрычныя дадзеныя варта фіксаваць на ўсёй плінфе, нават на невялікіх кавалках, якія былі выяўлены пад час раскопак, бо гэта дазволіць больш дакладна вызначыць статыстычную хібнасць і дасць больш дакладную інфармацыю аб памерах. У такім выпадку, варта весці збор усіх знойдзеных кавалкаў, якія маюць інфармацыю аб памерах. Згодна агульнай тэндэнцыі вывучэння старажытнай цэглы прынята абагульняць памер да 5 міліметраў. Так плінфа, з якой былі ўзведзены ніжнія часткі сцен галерэй мае памер (27.5-29.5) х (22.5-24.5) х (3-4) см. Варта адзначыць, што выкарыстанне рознага памеру плінфы, а гэта атрымаецца вызначыць толькі пры вывучэнні вялікага аб'ёма артэфактаў, можа сведчыць на карысць этапнасць будаўніцтва харама, дзейнасці розных брыгад майстроў і інш. Так вызначана, што будаўнічы матэрыял з такімі памерамі сустракаецца ў кладцы завяршэння асноўнага аб'ёма помнка [4, с. 13].

Першасная апрацоўка плінфы – гэта яе прамыўка вадой, высушванне і падрабязны візуальны агляд на наяўнасць дэфектаў, браку, слядоў ад формы, наплываў, знакаў на тарцах, малюнкаў або графіці на пастэлых, адбіткаў пальцаў майстроў ці слядоў жывёлы, птушак, травы, на характар абпалу і інш. У выпадку, калі пастэль або бок плінфы закрыты вапнавай рошчынай варта прыняць меры па расчыстцы, але пажадана, каб гэтую працу выконваў спецыяліст-рэстаўратар. Пры расчыстцы ад вапнавай рошчыны пожна нанесці пашкоджанні на плінфяной паверхні ў выглязе сколаў або драпін, што можа сказіць інфармацыю аб пэўных выявах. Таксама, рэстаўрацыйныя працы варта праводзіць, калі плінфа была выяўлена ў разламаным (раструшчаным) выглядзе. Найчасцей такое адбываецца пры доўгім уздзеянні на старажытную цэглу знешніх прыродных фактараў (вада, прамярзанне глебы) пры яе знаходжанні ў глебе.

Візуальны агляд таксама дае магчымасць вызначыць форму плінфы. У выпадку, калі выяўлена лекальная плінфа (трапецыяпадобная, скругленая, са сскошанымі тарцамі і інш.), то інфармацыя аб ёй фіксуецца асобна, найбольш рэдкія лекальныя плінфы могуць быць замаляваны. Лекальная плінфа выкарысітоўвалася ў першую чаргу для выкладвання не стандартных архітэктурных форм. Фіксацыя ле-

кальнай плінфы дазволіць больш дакладна адказаць на пытанні аб будаўнічых традыцыях помніка. Для лекальнай плінфы варта найбольш дэтальна праглядаць сляды аб форме, бо яны могуць сведчыць на карысць яе вырабу. На сённяшні дзень застаецца адкрытым пытанне, якім чынам была арганізавана раз'ёмная форма па вырабу плінфы: няма адказу, як мацаваліся паміж сабою бакавыя дошчачкі.

Асобна трэба звяртаць увагу на знакі на плінфе. Уся полацкая плінфа выраблялася ў раз'ёмнных рамках і таму шэраг экзэмпляраў утрымлівае адбіткі рэльефных знакаў на тарцах. Радзей сустракаюцца знакі на пастэлі плінфы. Фіксацыя і сістэматызацыя знакаў вельмі важна. Да сёняшняга дня няма адзінага адказу на пытанне аб прызначэнні знакаў на плінфе. Складанне каталагу па матэрыялам будаўнічых цэнтраў, дазволіла б вырашыць шмат пытанняў з датыроўкамі помнікаў, а таксама спрыяла б вызначэнню сувязяў паміж будаўнічымі арганізацыямі розных зямель Усходняй Еўропы [3, с. 401].

Вылікая колькасць помнікаў архітэктуры 10-13 стст. мае падлогі выкладзеныя з керамічных плітак з паліваю. Вызначана, што Спаса-Праабражэнскі храм не меў пліткавай падлогі, а падлога была сфарміравана слоем залашчонай вапнавай рошчыны. Пад час раскопак вакол храма сабрана багатая калекцыя паліваных плітак, якімі была аздоблена падлога драўлянага храма. Ён з'яўляўся папярэднікам Спаскай царкве і быў знішчаны пад час пажару.

Падыходы да апрацоўкі плітак падлогі вельмі падобная да працы з плінфай. Пранцыповым адрозненнам з'яўляецца наяўнасць паліванай паверхні на плітках. Гэта першае, на што звяртаюць увагу даследчыкі, бо колеры плітак падлогі могуць быць living рознымі і таму іх класіфікацыя па колеры вельмі важна, для далейшай працы па рэканструкцыі напольнага пакрыцця.

Большасць архітэктурных помнікаў старажытнай Русі былі расписаны фрэскамі. Да нашых дзён манументальны жывапіс моцна пашкоджаны. У большасці выпадкаў ён захаваўся часткова ці нават фрагментарна. На гэтым фоне Спаса-Праабражэнскі храм у Полацку вылучаецца, бо тут, у інтэр'еры асноўнага аб'ёма захавалася каля 90% роспісу 12 ст. Сучасная археалагічная методыка і рэстаўрацыйныя працы дазваляюць аднавіць выявы святых, якія былі знішчаны пры разбурэнні таго ці іншага помніка архітэктуры. Так, на сённяшні дзень вызначана, што Спаскі храм акаляўся прыбудовамі. Усе яны былі багата распісаны фрэскамі. У працэсе раскопак была выяўлена вялікая колькасць фрагментаў тынкоўкі з манументальным жывапісам, які выдатна захаваўся. Асобныя фрагменты жывапісу захаваліся на фасадах храма, якія да 17 ст. былі сценамі інтэр'ера галерэй.

Пад час працы па выманні фрагментаў жывапісу, першаснай апрацоўцы, інвентарызацыі і рэстаўрацыі выкарыстоўвалася метадыка распрацаваная і прыменена ў працы Цэнтра рэстаўрацыі манументальнага жывапісу Наўгародскага музея-запаведніка пад кіраўніцтвам Т.І. Анісімавай [2]. Да гэтай методыкі зроблены карэктыроўкі, якія абумоўлены характарам культурнага пласта вакол Спаскага храма і ўмовамі працы.

Выяўленыя фрагменты жывапісу ўяўляюць сабой кавалкі тынкоўкі таўшчынёю 0,5-1,2 см (з адхіленнем), адзін бок якой мае роўную паверхню з слоем фарбы. Памеры фрагментаў розныя: самыя вялікія кавалкі дасягаюць памеру 10х12 см. Асноўная маса фрагментаў мае памеры ад 3х3 см да 1х1 см і больш дробныя.

Працы па выманні фрагментаў жывапісу ажыццяўлялася студэнтамі-гісторыкамі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта і валанцёрамі[1]. Культурны пласт вымаўся з раскопа і насыпаўся на асобным месцы. Слой з пэўнага участка і з пэўнага пласта або аб'екта насыпаўся асобна. Пошук артэфактаў ажыццяўляўся пры дэтальнай пераборцы на спецыяльных дошчачках з дрэва-валаконнай пліты (ДВП). Іх праблізныя памеры 40х30 см. На адзін край ліста насыпаўся культурны слой і пры дапамозе шуфліка, нажа ці рукой перасыпаўся на супрацьлеглы бок ліста. Пад час перасыпання глебы пры ўважлівым назіранні збіраліся фрагменты тынкоўкі з жывапісам і іншыя археалагічныя артэфакты. Пасля таго, як уся насыпаная на ліст ДВП глеба была перабрана, яна скідвалася ў адвал. Участкі раскопа ці архітэктурныя канструкцыі, якія былі насычаны фрагментамі жывапісу і ўтрымлівалі мініммкультурнага пласта (асобныя саркафагі, прастора падземнага храма) разбіраліся пад час раскопвання адразу ў пластыкавыя скрынкі з пэўнымі паметкамі.

Сабраныя фрагменты тынкоўкі адразу павінны выкладвацца ў адзін слой у драўляныя скрынкі ці каробкі для далейшага прасушвання[2]. Пры сборы фрагментаў тынкоўкі ў пакункі або кучай ў адну скрынку можа нанесці механічную шкоду слою з фарбай, а таксама ёсць верагоднасць забруджвання цвіллю, што не дапушчальна для жывапісу. Кожная ёмістасць павінна мець бірку з пазначэннем месца вымання, годам раскопак, вызначэннем помніка, нумарам раскопа, нумарам участка, пласта і іншымі дадатковымі дадзенымі. Варта пазначаць і дакладную дату ажыццяўлення пераборкі або вымання фрэсак з раскопа.

---

[1] Выказваю шчырую падзяку ўсім ўдзельнікам экспедыцыі за праведезную складаную працу.

[2] З-за недахопу скрынак выкарыстоўваліся кардонныя каробкі, але яны хутка размакалі ад вільготных кавалкаў тынкоўкі і таму іх выкарыстанне не з'яўяецца мэтазгодным пры такім зборы артэфактаў.

Высушванне фрагментаў тынкоўкі з жывапісам павінен працягвацца не каля 3-ох месяцаў. Пасля высушвання фрагменты тынкоўкі перастаюць быць крохкімі.

Далей адбываецца праца ачысткі. Пры ачышчэнні фрагмент з жывапісам браўся за тарцы і забруджванні (рэшкті зямлі) выдаляліся шляхам абмятання мяккай шчацінай пэнзля (флейцы №40, №30) з тыльнага боку і з тарцоў. Абмятанне слою з фарбай таксама дапушчальна (пры неабходнасці!) пры выкарыстанні больш мяккага пэнзля (флейцы №50, №40). Потым фрагменты выкладваліся ў адзін слой ўжо на пастаяннае захоўванне або для далейшай апрацоўкі ў спецыяльныя скрынкі-“планшэты”[1], з пазначэннем інфармацыі аб месцы выяўлення дадзеных фрагментаў. Таксама варта кожнаму планшэту надаваць свой нумар і весці вопіс планшэтаў.

Існуе два варыянты выкладвання фрагментаў тынкоўкі з жывапісам на планшэты. У адным – жывапіс павінен ляжаць слоем фарбы ўніз. Такі варыянт варта прымяняць пры падрыхтоўцы знаходак для фондавага захавання. У другім выпадку тынкоўка кладзецца слоем фарбы ўверх. Ён прымяняецца ў рэстаўрацыйных майстэрнях, дзе ажыццяўляецца працэс аднаўлення жывапісу. Калекцыя жывапісу з раскопак пры Спаса-Праабражэнскім храме выкладзены па тэхналогіі другога варыянта.

Спецыялістамі-рэстаўратарамі ўжо распачата праца па падборцы і аднаўленню фрагментаў жывапісу. Станоўчая захаванасць фарбавага слою, вялікая колькасць фрагментаў, прымяненне методыкі па выманню знаходак і іх знешняе падабенства – усё гэта дае высновы меркаваць, што далейшая праца па падбору і склейванню можа быць вельмі эфектыўнай. Зараз вядзецца падрыхтоўка спецыяліста, які ў далейшым зможа працаваць з дадзенай калекцыя фрагментаў манументальнага жывапісу. Аднаўленне нават невялікай часткі роспісу зруйнаваных прыбудоў Спаскай царквы дазволіць зрабіць новыя адкрыцці адносна бачання жывапісу 12 ст.

У ходзе археалагічных і архітэктурных даследаванняў можна выявіць і іншыя знаходкі, якія цесна звязаны з будаўнічымі канструкцыямі: смальта, свінцовае пакрыццё (лісты) даху, каменныя ці ляпныя дэталі архітэктурных элементаў, вапнавую тынкоўку і інш. Усе яны таксама падлягаюць дакладнай фіксацыі і дэтальнай апрацоўцы, аднак працу з пералічанымі артэфактамі варта ахарактэрызаваць асобна.

---

[1] Планшэт – гэта скрынка памерамі 40х25 см. Паводле тэхналогіі планшэты павінны мець два супрацьлеглых борціка аднолькавай вышыні (каля 5 см). Дзве іншыя стараны борцікаў не маюць. Гэта зроблена для таго, каб адбывалася праветраванне. У нашым выпадку планшэты маюць чатыры борцікі: два борцікі вышынёю каля 5 см, і два борцікі вышынёю каля 2 см. Гэта дазваляе больш надзейна захоўваць фрагменты у выпадку перамяшчэннем планшэтаў у розныя месцы захавання.

На сённяшні дзень, найноўшыя тэхналогіі і новыя падыходы ў вывучэнні старажытнай архітэктуры дазваляюць больш дэтальна разглядаць працэс будаўніцтва помніка. Падрабязная праца з матэрыяламі археалагічных раскопак спрыяе больш дакладнай фіксацыі момантаў, звязаных з узвядзеннем будынка, яго мастацкімі асаблівасцямі. Гэта дае магчымасць разглядаць помнік не толькі ў кантэксце развіцця архітэктурных традыцый (макра ці мікра) рэгіёна, але і як асобны шэдэўр архітэктуры. Усе азначаныя акалічнасці і спецыфіку ў вывучэнні артэфактаў варта прымяняць не толькі пад час працы на храмах старжынай Русі, але і на іншых помніках архітэктуры больш позняга перыяду.


1. Воронин, Н. Н. Древнее Гродно / Н. Н. Воронин // Материалы и исследования по археологии СССР. – 1954. – № 41. – 240 с.
2. Галкина, О. М. Результаты работы рестовраторов с фрагментами живописи XII века церкви Благовещения на Городище. Сезон 2016 года / О. М. Галкина, Е. В. Трудникова // Новгородский музей-заповедник. Материалы н-пр. конф. Великий Новгород, 22–23 марта 2017 г. – Великий Новгород, 2018. – С. 48–53
3. Ёлшин, Д. Д. Новые иследования древнерусской плинфы: итоги и перпективы / Д. Д. Ёлшин // Археологія і давня історія України: сборник науч. Работ. – Киев: Институт археологии НАН Украины, 2010. – Вып. 1. – С. 395–407.
4. Торшын, Я. М. Спасціжэнне першапачатковай задумы архітэктуры Полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы: па выніках даследаванняў 2015 года / Я. Торшын, Д. Дук, А. Коц, А. Іаанісян, П. Зыкаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2016. – № 7. – С. 5–16.
5. Трусаў, А. А. Эвалюцыя будаўнічых матэрыялаў і тэхнікі манументальнага дойлідства Беларусі XI–XVIII стст. / А. А. Трусаў. – Мінск : БДУКіМ, 2020. – 306 с.


**Кусовская А. В.**

## ФОРМИРОВАНИЕ КУЛЬТУРОТВОРЧЕСКОЙ СРЕДЫ В СОЦИАЛЬНО-КУЛЬТУРНОЙ ИНФРАСТРУКТУРЕ УЧРЕЖДЕНИЯ ВЫСШЕГО ОБРАЗОВАНИЯ

***Ключевые слова:*** студенческая молодежь, культуротворческая среда, социально-культурная инфраструктура, учреждения высшего образования.

На студенческую молодежь оказывает воздействие широкий спектр факторов, динамических социокультурных процессов, тенденций, художественных течений и др. Их многообразие формирует уникальную культурную среду, которая играет важную роль в жизни и развитии студенческой молодежи. Сохранение, и распространение ценностно содержательных текстов культуры поддерживается и регулируется в рамках института трансляции социокультурного опыта в рамках социально-культурной инфраструктуры. В научных исследо-